тыра і інш.). Пашыраліся ўнутрынац. сувязі паміж феад.-царкоўнай, клерыкальнай і народнай плынямі (свецкая пісьменнасць пранікала ў агіяграфію, пашыралася лірыка вагантаў, хрысціянскія матывы ўплывалі на нар. і феад.-рыцарскую л-ру), развіваліся і міжнац. кантакты. Так, л-ра Кіеўскай Русі мела шырокія сувязі з л-рамі еўрап. краін, асабліва паўд.-славянскімі (гл. ў арт. *Візантыйская літаратура, Балгарская літаратура*). Рост міжнар. значэння Кіеўскай Русі спрыяў фарміраванню дзярж. інтарэсаў і патрыят. пачуццяў у яе насельніцтва; найб. значныя помнікі таго перыяду прасякнуты ідэяй сусв. славы рус. зямлі. На гэтым этапе амаль завяршыўся працэс складвання асн. культ. рэгіёнаў сярэдневяковай Еўропы, унутры славянскага рэгіёна адбывалася станаўленне нац. л-р, у т. л. беларускай. У эпоху Адраджэння замацавалася новае светаўспрыманне — *гуманізм*, характэрны для ўсіх краін таго часу. На Беларусі Адраджэнне развівалася пад уплывам Рэфармацыі, бел. гуманісты падтрымлівалі цесную сувязь з пратэстантамі Захаду, зах.-еўрап. ідэі кальвінізму былі вядомы і на яе тэрыторыі. У дзейнасці Ф. Скарыны ўвасобіліся асн. тэндэнцыі гіст. прагрэсу ў развіцці тагачаснай бел. культуры. Феадальна-каталіцкая рэакцыя, якая ўсталявалася ў многіх краінах Еўропы, затрымлівала літ. прагрэс. У адрозненне ад тых еўрап. краін, дзе ўмацавалася абсалютная манархія з агульнадзярж. афіцыйным стылем — *класіцызмам* (Францыя), на Беларусі ў 17 — пач. 18 ст. панавала *барока*. Літаратура 18 ст. ў Еўропе развівалася пад уплывам ідэалогіі *Асветніцтва*. Як і ў інш. краінах, на Беларусі асн. кірункамі шматмоўнай асветніцкай л-ры былі класіцызм і *сентыменталізм*; тут распаўсюджваліся ідэі франц. класіцыстаў, асветнікаў (Мальер, Вальтэр), сентыменталістаў (Ж. Ж. Русо). У канцы 18 — 1-й пал. 19 ст. ў найб. развітых капіталіст. краінах зарадзілася л-ра *рамантызму, крытычнага рэалізму*, паявіліся *натуралізм*, розныя дэкадэнцкія плыні (гл. ў арт. *Дэкадэнцтва*). Бел. л-ра ў гэты час праходзіла своеасаблівы «ўнутраны» перыяд развіцця, выкарыстоўваючы нар. вопыт, здабыткі бел. фальклору. З 19 ст. фарміравалася нац. самасвядомасць бел. пісьменнікаў, што пачалі ўсведамляць сябе прадстаўнікамі бел. нацыі (В. Дунін-Марцінкевіч, К. Каліноўскі, Ф. Багушэвіч). Гэта была л-ра народная, бо апіралася яна на нац. культ. спадчыну і адлюстроўвала інтарэсы маладой нацыі ў перыяд яе складвання. Інтэнсіўнасць і значнасць працэсу *паскоранасці*, хуткага і плённага складвання нац. бел. культуры яскрава выявілася на пач. 20 ст. ў творчасці Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, якія таленавіта і глыбока паставілі праблему развіцця чалавека ў сувязі з вечна зменлівым светам. Дзякуючы іх творчасці бел. л-ра заняла пачэснае месца ў сусв. літ. працэсе. Развівалася і развіваецца яна ў цесных узаемасувязях з рус., укр., польскай і інш. л-рамі (гл. *Літаратурныя ўзаемасувязі*). Сучасная бел. л-ра — неадрыўная частка адзінай шматнацыянальнай *савецкай літаратуры*, асн. творчы метад якой — *сацыялістычны рэалізм*. Пашырэнне і ўмацаванне пазіцый гэтага метаду ў л-рах свету стала з'явай сусветнага літ. працэсу.

*Літ.:* К. Маркс и Ф. Энгельс об искусстве. Т. 1—2.— 4 изд.— М., 1983; В. И. Ленин о литературе и искусстве.— 6 изд.— М., 1979; Неупокоева И. Г. История всемирной литературы.— М., 1976; Конрад Н. И. Запад и Восток.— 2 изд.— М., 1972; Проблемы истории и теории мировой культуры.— М., 1974; История всемирной литературы: В 9 т. Т. 1—3.— М., 1983—85; Каваленка В. А. Вытокі. Уплывы. Паскоранасць.— Мн., 1975; Адамовіч А. Здалёк і зблізку.— Мн., 1976; Славянские культуры и мировой культурный процесс: Материалы междунар. науч. конф. ЮНЕСКО.— Мн., 1985.
*Г. Я. Адамовіч.*

**СУСВЕ́ТНЫЯ ВО́БРАЗЫ,** умоўная назва вобразаў літаратурных герояў, якія ўзніклі ў канкрэтную гістарычную эпоху, але ў свядомасці людзей наступных эпох ператварыліся ў мнагазначныя і шырокавядомыя сімвалы, вдольныя ўвасабляць з'явы агульначалавечага зместу. Гл. *Вечныя вобразы.*

**СУ́СЛАЎ** Уладзімір Васілевіч (1857—1921), рускі архітэктар. Скончыў Пецярбургскую Акадэмію мастацтваў (1893). Вывучаў і прапагандаваў помнікі стараж.-рус. архітэктуры, асабліва драўлянага дойлідства. На Беларусі рэстаўрыраваў Камянецкую вежу (1903) і выканаў праект рэстаўрацыі Ільінскай царквы ў Віцебску. *А. А. Трусаў.*

**«СУСТРЭ́ЧЫ»,** літаратурна-грамадскі часопіс бел. студэнтаў у ПНР. Выдаецца з 1984 у Варшаве Гал. радай згуртавання польск. студэнтаў. Асвятляе жыццё беларусаў у ПНР, дзейнасць Рады культуры студэнтаў бел. нацыянальнасці (РКСБН), Бел. грамадска-культ. т-ва (БГКТ), удзел студэнцтва ў развіцці і пашырэнні бел. нац. культуры. На старонках часопіса выступаюць маладыя паэты, празаікі, публіцысты, мастакі. Папулярызуе культуру Сав. Беларусі і інш. сацыяліст. краін. Малюнкі і фотаздымкі адлюстроўваюць побыт, звычаі і абрады студэнцкай моладзі, фалькл. і этнагр. традыцыі бел. насельніцтва Беластоцкага ваяв. ПНР. *А. К. Каўко.*

**СУХАВЕ́РХАВА** Наталля Уладзіміраўна (н. 3.11.1949, Мінск), беларускі сав. мастак дэкар.-прыкладнога мастацтва. Дачка У. П. *Сухавер-*



Н. Сухаверхава. Габелен «Зачараваны край». Лён, воўна. 1981.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ